КАНФЕРЭНЦЫЯ
НОВАЯ
БЕЛАРУСЬ

# Дэкларацыя аб адказнасці і аднаўленні справядлівасці

[ Канферэнцыя Новая Беларусь 03-04 Жніўня 2024 ]

***Мы, дэмакратычныя сілы Беларусі, лічым аднаўленне справядлівасці для пацярпелых і забеспячэнне непазбежнасці адказнасці для вінаватых адными з галоўных элементаў на шляху да дэмакратычных пераўтварэнняў і нацыянальнага прымірэння.***

Мы канстатуем, што Аляксандрам Лукашэнкам і яго атачэннем здзейснены шэраг дзеянняў, якія могуць быць кваліфікаваныя ў адпаведнасці з міжнародным правам і нацыянальным заканадаўствам як злачынствы супраць чалавечнасці, злачынства агрэсіі супраць Украіны, ваенныя злачынствы супраць украінскага цывільнага насельніцтва, злачынства супраць міра і бяспекі чалавецтва, злачынствы супраць жыцця і здароўя, злачынствы супраць дзяржавы.

Апроч маштабных і сістэматычных катаванняў, згвалтаванняў, гвалтоўных знікненняў, пазбаўлення волі, забойстваў, Аляксандр Лукашэнка ажыццяўляе пераслед па палітычных падставах, вынікам якога стала найбуйнейшая хваля прымусовай міграцыі грамадзянскага насельніцтва ў Еўропе ў 21 стагоддзі. Ахвярамі змушанага выгнання сталі каля 300 000 чалавек.

Мы нагадваем, што, у тым ліку, з 2020 года ў Беларусі здзяйсняецца ўтрыманне дзяржаўнай улады неканстытуцыйным шляхам. Кожны, хто ўдзельнічае ў арганізацыі выбарчых і іншых дзяржаўных працэдур, якія маюць на мэце падтрыманне і захаванне ўлады Аляксандра Лукашэнкі, з’яўляецца саўдзельнікам злачынства. Аднак кожны пазбегне адказнасці, калі ён дабравольна заявіць аб злачынстве і будзе садзейнічаць яго выкрыццю.

Кожны, хто быў рэпрэсаваны або іншым чынам пацярпеў ад дзеянняў уладаў Рэспублікі Беларусь, пачынаючы з дня ўступлення Аляксандра Лукашэнкі на пасаду прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, павінен быць адноўлены ў сваіх правах і законных інтарэсах у адпаведнасці са спецыяльным Законам аб рэабілітацыі ахвяр палітычных рэпрэсій.

Мы заклікаем міжнародную супольнасць задзейнічаць даступныя міжнародныя механізмы адказнасці. У прыватнасці, перадаць сітуацыю з прымусовай міграцыяй грамадзянскага насельніцтва з Беларусі ў Офіс пракурора Міжнароднага крымінальнага суда, задзейнічаць працэдуры ўніверсальнай юрысдыкцыі на нацыянальным узроўні, падаць справы супраць Беларусі ў Міжнародны суд ААН аб парушэнні міжнародных дагавораў, па якіх суд патэнцыйна валодае юрысдыкцыяй.
Мы падтрымліваем міжнародныя намаганні па прыцягненні да адказнасці Аляксандра Лукашэнку і яго атачэнне за здзяйсненне акта агрэсіі супраць Украіны і ваенныя злачынствы супраць украінскага цывільнага насельніцтва.
Мы гарантуем, што працэсы па аднаўленні справядлівасці і прыцягненні да адказнасці вінаватых не будуць мець на мэце помсту ці палітычны пераслед.
Правасуддзе будзе ажыццяўляцца па міжнародных стандартах і пры ўдзеле незалежных экспертаў і назіральнікаў на прынцыпах дэмакратычнасці, незалежнасці і адкрытасці, з правам на абарону і абскарджанне, у тым ліку ў

міжнародных інстанцыях.

Без якасна праведзенай рэабілітацыі пацярпелых і асуджэння злачынстваў Аляксандра Лукашэнкі і яго атачэння немагчыма перайсці да ўстойлівай дэмакратыі ў Беларусі без рызыкі вяртання дыктатуры.

*Прынята на Канферэнцыі Новай Беларусі*
*г. Вільнюс, 3-4 Жніўня 2024*